# Намаганні і творчы патэнцыял

**Выстаўка «Ад прадзедаў…» працуе ў карцінннай галерэі «Універсітэт культуры». Экспазіцыю склалі творы, выкананыя ў розных тэхніках: графіка, жывапіс, акварэль, вышыўка, ткацтва, саломапляценне, выцінанка, разьба, роспіс па шкле і кераміка. Аўтары — пераможцы і дыпламанты Мінскага гарадскога фестывалю-конкурсу народнай творчасці «Сузор'е». Заснавальнікамі і арганізатарамі праекта выступаюць упраўленне культуры Мінгарвыканкама і «Мінскканцэрт».**



*Фрагмент экспазіцыі.*

Фестываль «Сузор'е» кожныя тры гады збірае разам аматарскія калектывы, каб іх удзельнікі прадэманстравалі свае напрацоўкі. Выстаўка «Ад прадзедаў…» — заключны этап фэсту: шырокаму колу гледачоў прэзентуюць найлепшыя работы юных аўтараў. Кожны з прадстаўленых калектываў, як адзначаюць арганізатары, здолеў прадэманстраваць сваю ўнікальнасць. А мэта, якая была пастаўлена перад імі, — адлюстраваць жывую традыцыйную культуру і нацыянальныя асаблівасці беларусаў. І выяўленчае мастацтва, і традыцыйныя віды творчасці дазваляюць дасягнуць гэтага, няхай вынікі і дастаткова розныя.

Першае, што заўважаеш на выстаўцы «Ад прадзедаў…», — творы з керамікі. Магчыма, таму, што адразу пазнаеш так званую бабруйскую школу мастацкай керамікі. Аднак гэта не дзіўна і не супярэчыць канцэпцыі выстаўкі. Справа ў тым, што ў экспазіцыі шмат твораў удзельнікаў Узорнай студыі дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Мастацкая кераміка». Кіруе творчым працэсам, дапамагае падапечным, якія робяць упэўненыя шляхі да авалодання майстэрствам керамікі, Максім Калтыгін. Мастак і педагог — сын Валерыя Калтыгіна, старшыні Бабруйскай гарадской арганізацыі Беларускага саюза мастакоў і кіраўніка міжнароднага пленэру па кераміцы «Арт-Жыжаль». Тыя, хто знаёмы з творчасцю славутых майстроў, адразу заўважаць падабенства іх твораў з работамі пачаткоўцаў. Тут ёсць нагода паразважаць не толькі



*Ганна Федарук «Птушкі».*

пра місію і магчымасці настаўніка як праваднікa ведаў і ўменняў, пра яго ўплыў на дзяцей, але і пра сапраўдную пераемнасць — у адзін з аўтарскіх калектываў уваходзяць некалькі юных мастакоў з адным прозвішчам — Калтыгіны.

Кожны з калектываў прадэманстраваў тое, над чым ішла работа апошнім часам, аднак хацелася б вылучыць творы ўдзельнікаў Народнай студыі выяўленчага мастацтва «Востраў». Рознаўзроставыя аўтары — розныя і іх работы, створаныя пад кіраўніцтвам розных педагогаў. Аднак ужо сёння відавочныя і намаганні старэйшага пакалення, і творчы патэнцыял дзяцей, юнакоў і дзяўчат… Ды, безумоўна, для ўсіх удзельнікаў гарадскі фестываль, фінальная выстаўка ў цэнтры Мінска сталі сведчаннем недарэмнай працы, штуршком для далейшай творчасці і, будзем спадзявацца, нагодай вяртацца да традыцый продкаў.

Наведаць экспазіцыю «Ад прадзедаў…» у галерэі «Універсітэт культуры» можна да 18 снежня.

**Яўгенія ШЫЦЬКА,**
**фота аўтара**


Лім Частка гісторыі і культуры нашай краіны



*Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі.*
*Выходзіць з лютага 1932 года. Штотыдзень — 16 старонак*

• Паэзія • Проза • Літаратурная крытыка • Бібліятэчная прастора • Музеі • Выяўленчае мастацтва • Тэатр • Музыка • Архітэктура • Краязнаўства • Кінематограф

| Падпісныя індэксы: | Цана, руб | | |
|---|---|---|---|
| 63815 – індывідуальная льготная падпіска | 13,70 | 41,10 | 82,20 |
| 63856 – індывідуальная падпіска | 19.70 | 59.10 | 118.20 |
| 63880 – ведамасная льготная падпіска | 41,00 | 123,00 | 246,00 |
| 63416 – ведамасная льготная падпіска (для юрыдычных асоб, якія афармляюць падпіску у адрас сваіх работнікаў і пенсіянераў) | 19,70 | 59,10 | 118,20 |
| 638562 – ведамасная падпіска | 53,80 | 161,40 | 332.80 |

**Шаноўныя сябры!**

*У нас добрая навіна:*